# Прыцягальныя контуры

## МІНСК РЫХТУЕЦЦА ПРЫМАЦЬ ШТОГОД ПА МІЛЬЁНУ ГАСЦЕЙ

**Многія ведаюць Мінск як буйны прамысловы горад. За апошнія гады сталіца стала эпіцэнтрам палітычных, эканамічных, культурных, спартыўных ды іншых міжнародных падзей. У далейшым візітоўка краіны павінна стаць яшчэ больш прывабнай, прыцягальнай і за лік развіцця турыстычнай інфраструктуры актыўна папаўняць бюджэт і стымуляваць стварэнне новых працоўных месцаў.**

### Топ-5 гістарычных месцаў

1. **Гарадская Ратуша, пабудавана ў 1600 годзе.**
2. **Кафедральны сабор на Нямізе. Галоўны храм Беларускага экзархата Рускай праваслаўнай царквы.**
3. **Траецкае прадмесце.**
4. **Сабор Святых апосталаў Пятра і Паўла.**
5. **Ракаўскае прадмесце.**

### ПА ЎРАЖАННІ, ГРОШЫ І ЗДАРОЎЕ

Штогод Мінск наведваюць як мінімум 600—700 тысяч гасцей. Адных вабіць Траецкае прадмесце, падземны цэнтр "Сталіца", новая Нацыянальная бібліятэка, іншыя прыязджаюць у сталічныя тэатры ці на канцэрты зорак у Палац Рэспублікі або "Мінск-Арэну".

У сталіцы дзейнічае звыш 4 тысяч прадпрыемстваў з замежным капіталам. Таму і не дзіўна, што многіх у галоўны горад Беларусі прыцягваюць камерцыйныя справы.

Хутка развіваецца такі адносна новы напрамак, як аздараўленчы турызм. Стаматалогія, анкалогія, рэпрадукцыя, комплекснае абследаванне — дзеля гэтага, а таксама прывабных суадносін кошту і якасці паслуг замежнікі, у першую чаргу расіяне, гатовы нямала заплаціць за дарогу ў Мінск. Папулярнасць аздараўленчага турызму ў гасцей з Еўрасаюза, краін Блізкага Усходу, як адзначаюць эксперты, у значнай ступені будзе залежаць ад таго, наколькі актыўна айчынныя медыкі будуць атрымліваць міжнародныя сертыфікаты і наколькі замежныя страхавыя кампаніі будуць гатовыя аплачваць сваім кліентам паслугі ў мінскіх клініках.

У бліжэйшы час плануецца дамагчыся таго, каб штогод нашу сталіцу наведвалі па 1 мільёну чалавек. Гэта амаль што ўдвая больш, чым цяпер. Але такое жаданне абавязкова прыйдзецца падмацаваць значнымі капіталаўкладаннямі, развіццём інфраструктуры.

### МЕНШ "ЗОРАК" — БОЛЬШ ПРЫБЫТКУ?

"Ёсць тры "кіты", ад якіх залежыць павелічэнне аб'ёмаў уязнога турызму", — расказвае намеснік начальніка ўпраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінгарвыканкама Віталь Машачкоў.

Першы з іх — гэта пункты размяшчэння, гасцініцы. У Мінску цяпер іх 28. Яны разлічаны прыкладна на 5,5 тысячы месцаў. Турыст у сярэднім праводзіць у горадзе 6 дзён. Таму можна падлічыць, што нават пры стопрацэнтнай загружанасці гатэляў сталіца гатова прыняць за год не больш як 600—700 тысяч чалавек. Пры гэтым трэба ўлічваць, што цяпер прыкладна палова прыезджых — грамадзяне Беларусі.

Сітуацыя павінна кардынальна змяніцца да 2014 года, калі ў сталіцы пройдзе чэмпіянат свету па хакеі. Ужо цяпер ідзе будаўніцтва або рэканструкцыя шасці гасцініц. Усяго ў планах — 20 новых гатэляў. У выніку колькасць месцаў павінна



ВАДЗІМ КАНДРАШОЎ

павялічыцца на 5 тысяч, альбо амаль падвоіцца.

“Цэнавы сегмент Мінска — замежнікі з сярэднім узроўнем даходаў”, — лічыць Віталій Машачкоў. Таму ў далейшым гатэлі класа чатыры альбо пяць зорак будуць менш запатрабаванымі, чым больш танныя трохзоркавыя. І гэта значыць, што у далейшым у сталіцы будуць адкрывацца найперш трохзоркавыя. Зніжэнне “зорнасці” і абвастрэнне канкурэнцыі паміж гасцініцамі павінна прывесці да патаннення пражывання, што будзе стымуляваць прыток турыстаў, пойдзе на карысць і беларускім вандроўнікам.

## БЯЗМЕЖНЫ І РЭКЛАМНЫ РЭЗЕРВ

Другі “кіт” — магчымасць свабоднага перасячэння мяжы. Цяпер прыкладна кожны другі іншаземец, які прыязджае ў нашу сталіцу, з Расіі. І ўсё гэта — эфект сталых дзелавых і культурных сувязей, празрыстасці межаў і адзінай рускамоўнай прасторы.

Да Мінска таксама праяўляюць інтарэс і прадстаўнікі Еўрасаюза, арабскіх краін. Змякчэнне візавага і мытнага рэжыму магло б падагрэць іх цікавасць. Напрыклад, вядома, што пасля таго як Украіна спрасціла ўмовы візітаў гасцей з Еўрасаюза, аб'ём уязнога турызму вырас утрая. Калі ж Расія і Ізраіль адмянілі візы для грамадзян дзвюх краін, плынь турыстаў вырасла ў чатыры разы. Беларусь таксама працуе ў гэтым кірунку.

І, нарэшце, трэці “кіт” прывабнасці — актыўная маркетынгавая палітыка. Трэба не толькі знішчаць бар'еры, але і актыўна развіваць турыстычную інфраструктуру. Прапаноўваць не проста месца для пражывання і небагаты выбар экскурсій, а вялікі набор разнастайных паслуг.

### Топ-5 МЕСЦАЎ НАШАГА ЧАСУ

1. **Нацыянальная бібліятэка.**
2. **Шматфункцыянальны комплекс “Мінск-Арэна”.**
3. **Аднноўлены Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс.**
4. **Храм-помнік Усіх Святых.**
5. **Падземны цэнтр “Сталіца” (адзін з самых вялікіх у Еўропе).**

## ПРЭФЕРЭНЦЫІ ДЛЯ ГАСЦІННАСЦІ

Кожны замежны турыст у Беларусі за дзень набывае тавараў і паслуг на 200—250 долараў. Як сведчыць замежны вопыт, кожныя восем турыстаў ствараюць адно новае працоўнае месца. Турыстычны сектар нашай краіны — гэта важны эканамічны і сацыяльны рэзерв. Вельмі важна ім па-гаспадарску распарадзіцца.

На Мінск цяпер прыходзіцца львіная доля замежных турыстаў, якія наведваюць Беларусь. Таму яму і належыць галоўная скрыпка. Але гэтую скрыпку па-сапраўднаму ацэняць толькі тады, калі яна загучыць у зладжаным аркестры. І гэта значыць, што трэба стымуляваць развіццё сектара ва ўсёй краіне.

Некаторыя спрыяльныя меры могуць быць прынятыя ў бліжэйшы час. Як паведаміў намеснік дырэктара дэпартамента па турызму Міністэрства спорту і турызму Андрэй Мартынаў, падрыхтаваны праект указа Прэзідэнта. У адпаведнасці з гэтым дакументам, напрыклад, плануецца знізіць стаўку падатку на дадатковую вартасць на паслугі гасцініц, спрасціць працэдуру выдзялення зямельных участкаў пад будаўніцтва кафэ, іншых аб'ектаў турыстычнай інфраструктуры.

“Мы хацелі б увесці для замежнікаў сістэму такс-фры”, — назваў прадстаўнік дэпартамента яшчэ адзін кірунак стымулявання. Такая сістэма дазваляе іншаземцам вярнуць сабе частку падаткаў, якія яны заплацілі пры набыцці тавараў і паслуг на тэрыторыі краіны турыстычнай паездкі.

Яшчэ адна прапанова — ільготы для развіцця ў нашай краіне пляцовак для размяшчэння так званых дамоў на калёсах для аўтатурыстаў.

Калі ў цэлым наша дзяржава стане больш прывабнай для турыстаў, тады і Мінск зможа паспрачацца з іншымі краінамі свету за прыцягненне гасцей і вялікіх грошай.

Андрэй **Руплівы**

